ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

№ 35 (171)
25 лістапада 2000 г.

СТР. 3
ДОЛГИЙ ПУТЬ К МИРУ
Подробности азиатско-тихоокеанского сотрудничества

СТР. 4
ДЫПЛАМАТЫЧНАЯ МІСЫЯ
Вандроўка апазыцыянераў па Эўропе

СТР. 4
ЧАЦЬВЁРТАЯ ЎЛАДА
Маніторынг беларускіх мас-мэдыя

СТР. 4
TV ПРАГРАМА 27 лістапада — 3 снежня

ГОДОВЩИНА

ЗАЗЕРКАЛЬЕ

Александр КАВАЛЬСКИЙ

Есть страны, живущие по законам. Их принято называть правовыми государствами. Есть страны, живущие по понятиям — например, Россия. Беларусь уже четыре года живет по декретам, то есть по понятиям одного человека. Начало такой ситуации было положено ноябрьским референдумом 1996 года.

— Чем ниже моя голова, тем глубже мои мысли

24 ноября 1996 года свой концерт в Минске отменила группа «Моральный кодекс». Наверное, их напугала телевизионная картинка из белорусской столицы и комментарии российских журналистов о том, что Беларусь стоит на грани гражданской войны. Никакой войны, естественно, не было. И быть не могло, хотя бы по той причине, что во всей стране не нашлось ни одного человека, согласного сражаться за свободу по-мужски. Депутаты Верховного Совета предпочитали, засунув голову в песок, подождать развязки. А спикер парламента Семен Шарецкий вел себя, как кэрролловский Труляля, давая понять журналистам, что «*вообще-то я очень храбрый, только сегодня у меня болит голова*».

Из всего ВС только трое зарекомендовали себя настоящими политиками, а не прирожденными мальчиками для битья. Андрей Климов первым назвал Лукашенко узурпатором и предложил его арестовать за попытку государственного переворота. Геннадий Карпенко стащил с трибуны президентского эмиссара Ивана Пашкевича. Виктор Гончар не смирился с антизаконным смещением с должности председателя Центризбиркома. Все трое в течение одного года исчезли с политической сцены: Климова посадили, Карпенко умер при загадочных обстоятельствах, Гончар пропал.

— Можем договориться: если ты будешь верить в меня, я буду верить в тебя. Идет?

События ноября 1996 года были бы невозможны, если бы президент в своих антиправовых действиях не опирался на коллаборационистов: депутатов ВС, судей Конституционного суда или чиновников, согласных ради сохранения своего благосостояния на соучастие в государственном перевороте. Психология этих людей больше соответствует не условиям существования в гражданском обществе, а средневековым принципам союза подданства. Как кэрролловская героиня, они «*согласны быть пешкой*» при дворе, лишь бы их взяли. Их альянс с Лукашенко напоминает связь сеньора с вассалом, которые договорились о взаимном признании. Такие органы, как двупалатное Национальное собрание, Комиссия по выборам и проведению референдумов, Конституционный суд, легитимны не по правовым основаниям, а по решению президента, поскольку и до тех пор, пока признают легитимность его самого. Поэтому поражаешься, когда некоторые очень деловые газеты статьи про деятельность палатки помещают под рубрику «парламент». Палата представителей не является парламентом ни юридически, ни фактически (по объему своих полномочий). Не называют же парламентом какой-нибудь съезд советов образца 1917–1991 годов.

Из всего госаппарата в 1996 году гражданской позицией обладали только премьер Михаил Чигирь и заместитель министра иностранных дел Андрей Санников. Из-за несогласия с проводимой политикой они променяли свои теплые места в правительстве на нелегкую оппозиционную судьбу — совершили своего рода чиновничье самоубийство по этическим причинам.

— Нельзя поверить в невозможное. Просто у тебя мало опыта

Постепенно за четыре года из памяти стираются все фальсификации ноябрьского референдума, а с экрана первого и пока (слава Богу!) единственного национального канала не устают повторять, что нынешний режим — это выбор самого народа. Демократические политики вместо того, чтобы участвовать в очередном назначении депутатов в палату №2, лучше бы напомнили людям про то, как формировалась первая и что этому предшествовало. Например, про то, что в Минске больше половины участвовавших в референдуме проголосовали после шести вечера. Что досрочное голосование растянулось на две недели. Что бюллетени печатались и распространялись президентской вертикалью, а не Центризбиркомом. Что никто из наблюдателей не смог проконтролировать подсчет реальных результатов. Что по решению Конституционного суда вопрос об изменении Конституции носил консультативный характер. Что в созданной президентским указом палате не были представлены депутаты от более чем половины избирателей Беларуси.

—Навстречу? — переспросила Роза. — Так ты ее никогда не встретишь. Я бы тебе посоветовала идти в обратную сторону

Хорошим уроком референдума, не освоенным двоечниками из числа демократической оппозиции, является то, что с Лукашенко бесполезно договариваться. Любое движение навстречу, консенсус он воспринимает как слабость своего противника и реагирует на нее соответственно. Вспомним хотя бы мировое соглашение между ВС и президентом, подписанное при российском посредничестве Шарецким, Тихиней и Лукашенко за два дня до референдума. Соглашение было сорвано при утверждении парламентом: после загадочного звонка на мобильный телефон лидеру пропрезидентской фракции «Согласие» Владимиру Коноплеву большинство ее депутатов проголосовало против документа, подписанного самим Лукашенко.

Таковы же итоги всех переговоров или общественных диалогов, которые пытались провести при посредничестве ОБСЕ: президент берет на себя только те обязательства, которые ему выгодны, и отказывается от остальных. Он вовлекает в свою игру, в которой может произвольно на ходу менять правила. Единственный шанс его победить — придумать свою игру.

НАПЕРЭДАДНІ

У ліпені 2001 — з'езд беларусаў свету

Таццяна АНТОНАВА-МЕЛЬЯНОВІЧ

21 лістапада ў Мінску адбылося паседжанне Малой рады Міжнароднай грамадскай арганізацыі «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына».

На ёй абмяркоўвалася пытанне аб скліканні чарговага Трэцяга з'езда беларусаў свету. Перад прысутнымі выступіў прэзідэнт ЗБС акадэмік Радзім Гарэцкі. Ён адзначыў, што ў перыяд, які прайшоў з другога з'езда, у краіне адбыліся вялікія перамены, і дзяржавай зроблены вялікія намаганні, каб раскалоць беларускую дыяспару. У прыватнасці, створана альтэрнатыўная «Бацькаўшчыне» арганізацыя «Святло Радзімы».

Нягледзячы на вялікія цяжкасці, ЗБС працягвае дзейнічаць, ажыццяўляе кантакты з замежнымі суайчыннікамі. Наконт правядзення чарговага з'езда ўжо адбыліся перамовы з прадстаўнікамі беларускіх суполак у замежжы. Атрымана згода на ўдзел з ЗША, Бельгіі, Аўстраліі і іншых краін. Па кожнай краіне вызначаны каардынатар. Статус дэлегата атрымаюць члены Вялікай рады і па жаданні ад кожнай суполкі ад трох да пяці чалавек. Максімальна будзе 500 дэлегатаў, а мінімальна — 170.

Створаны аргкамітэт з'езда, абраныя сустаршыні: В. Кіпель, Ю. Герасімаў, І. Саверчанка. На з'ездзе, які адбудзецца ў ліпені 2001 года ў Мінску, з дакладам «*Беларусь і беларусы на мяжы стагоддзяў*» выступіць Р. Гарэцкі.

СЕМЬ ДЗЁН

Кожнаму свае

Антон ЛЯЎКОВІЧ

Цэнтар апазыцыйнай актыўнасьці зьнянацку перамясьціўся зь Беларусі ў Заходнюю Эўропу. Лідэры Каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў наведалі шэраг эўрапейскіх сталіцаў, мелі там шмат сустрэчаў з уплывовымі палітыкамі, і вярнуліся задаволеныя вынікамі свайго візыту.

Пасьля вяртаньня ў Беларусь лідэр партыі БНФ Вінцук Вячорка заявіў, што кіраўніцтва эўрапейскіх краінаў і структураў мае адзіны погляд на палітычную сытуацыю ў Беларусі. На думку эўрапейцаў, Беларусь стане дэмакратычнай краінаю толькі ў тым выпадку, калі на прэзыдэнцкіх выбарах перамажа адзіны кандыдат ад апазыцыі. Асабліва важным выглядае ў гэтай справе тое, што эўрапейскія палітыкі абяцалі аказаць падтрымку беларускай апазыцыі на расейскім напрамку.

Паводле лідэраў апазыцыі, у Эўропы ёсьць шмат магчымасьцяў, каб паўплываць на Маскву па беларускім пытаньні. Вінцук Вячорка лічыць, што найлепшым выйсьцем зь цяперашняе сытуацыі было б захаваньне Расеяй нэйтралітэту ў справе прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. Крэмль не павінен падтрымліваць ніводнага з кандыдатаў на пасаду беларускага прэзыдэнта. Лідэры аб'яднанай апазыцыі ў сваю чаргу запэўнілі эўрапейцаў, што падтрымліваюць ідэю правядзеньня газаправоду з Расеі празь беларускую тэрыторыю ў Заходнюю Эўропу, паколькі гэты праект ёсьць у нацыянальных інтарэсах Беларусі.

Гэтым самым апазыцыянэры адрынулі ад сябе абвінавачваньні Аляксандра Лукашэнкі ў тым, што апазыцыя выступае супраць будаўніцтва газаправоду і такім чынам хоча пазбавіць Беларусь інвэстыцыяў у памеры 2 мільярдаў даляраў.

Лукашэнка, які ня можа не заўважаць актыўнасьці сваіх апанэнтаў на зьнешніх палітычных рынках, вырашыў у чарговы раз перастрахавацца й узмацніць аддзел кадраў сваёй адміністрацыі праверанымі і адданым чалавекам. Ім стаў былы міністар унутраных справаў Юры Сівакоў. Зразумела, што для Аляксандра Лукашэнкі было б неабачліва напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў пакідаць такога чалавека па-за сваёй камандай. Беларускі правадыр спадзяецца, што сумленны служака Сівакоў выканае любы загад свайго патрона і ня здрадзіць яму ў самы адказны момант.

Падобна, што па той жа прычыне Лукашэнка забараніў балятавацца на пасаду сьпікера палаты свайму бліжэйшаму сябру Уладзіміру Канаплёву. Паводле некаторых зьвестак, Канаплёў неўзабаве павінен заняцца вельмі адказнай справай — узначаліць перадвыбарчы штаб Лукашэнкі. А на нязначную пасаду кіраўніка палаты цалкам падыходзіць і невядомы шырокай публіцы міністар сельскай гаспадаркі Вадзім Папоў.

У рамках сваёй перадвыбарчай кампаніі Аляксандар Лукашэнка робіць і больш шырокія папуліскія крокі. Дарэчы, ён правёў нараду з кіраўніцтвам Міністэрства аховы здароўя, дзе арганізаваў публічны разнос міністру Ігару Зелянкевічу й ягоным падначаленым. Зрабіўшы вялікія вочы, Лукашэнка крычаў на галоўных беларускіх лекараў, абвінавачваў іх у наўмысным завышэньні коштаў на лекі, няякасным медычным абслугоўваньні й гэтак далей.

Акцыя была яўна разьлічаная на падняцьце рэйтынгу Лукашэнкі сярод неабазнаных у асабівасьцях перадвыбарчых тэхналёгіяў правінцыйных выбаршчыкаў. Маўляў, глядзіце, людзі, як прэзыдэнт клапоціцца аб вашым здароўі й дабрабыце.

Відаць, уладныя піар-тэхнолягі цяпер раяць Лукашэнку рабіць большы ўхіл на абарону сацыяльных правоў грамадзянаў і менш рэагаваць на палітычныя абвінавачваньні ў свой адрас. Хутчэй за ўсё, гэтым тлумачыцца даволі вялая рэакцыя Аляксандра Лукашэнкі на абвінавачваньні Тамары Рохлінай і невядомага афіцэру КГБ. Нагадаю, што ўдава расейскага генэрала, пакараная за забойства свайго мужа 8-мю гадамі зьняволеньня, заявіла ў судзе, што менавіта Аляксандар Лукашэнка фінансаваў групу левых расейскіх вайскоўцаў на чале са Львом Рохліным, якія хацелі арганізаваць пераварот супраць Барыса Ельцына. Ананімны ж афіцэр беларускага КГБ абвінаваціў Лукашэнку й ягоную Раду бясьпекі ў перашкодах сьледзтву ў справе Зьміцера Завадзкага.

Лукашэнка нібыта хоча дапамагчы пазьбегнуць адказнасьці некалькім супрацоўнікам сваёй службы бясьпекі, якія падазраюцца ў забойстве апэратара тэлекампаніі ОРТ. Цяпер Лукашэнку параілі зрабіць паўзу й не выказвацца рэзка на падобныя тэмы. Маўляў, лепш гэта зрабіць перад выбарамі.

ДОРОГИЕ ЧИТАТЕЛИ!
ПРОДОЛЖАЕТСЯ ПОДПИСКА НА ЕЖЕНЕДЕЛЬНУЮ ГАЗЕТУ «ЗГОДА»
СТОИМОСТЬ ПОДПИСКИ НА МЕСЯЦ — 253 РУБЛЯ
ПОДПИСНОЙ ИНДЕКС 63138

АНЕКДОТ-С

– Товарищ верховный главнокомандующий, разрешите доложить?

– Докладывайте.

– Ваше приказание выполнено.

– Я же вам ничего еще не приказывал!

– А мы ничего и не делали.

***

– Кто больше всех огорчается, что американцы никак не могут посчитать избирательные бюллетени на президентских выборах?

– Конечно, белорусы. Жалеют, что среди кандидатов нет президента Лукашенко.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ

УВАЖЕНИЕ

«Уважай права и свободы других – и твои права и свободы будут обеспечены»

(А. Лукашенко, первое заседание Палаты представителей 2-го созыва, 21.11.00)

НАШИ ВИГИ

«БНФ и БПП являются партиями, исповедующими консервативные ценности, с той лишь разницей, что БПП проповедует ценности СССР, а БНФ – ценности Великого княжества Литовского»

(С. Посохов, «Белорусская газета», 17.11.00)

ВТОРСЫРЬЕ

«Беларусь кое-кто хотел бы превратить в «свалку религиозных отходов, накопившихся в Европе и США»

(В. Ганкина, Ю. Федотова, «Рэспублика», 22.11.00)

НАВІНЫ

СПРАВА ЗАВАДЗКАГА. Генеральная пракуратура РФ атрымала ад ОРТ арыгінал фільма Паўла Шарамета «Дзікае паляванне» і перадачу «Жди меня», у якой удзельнічала маці Змісцера Завадзкага. Гэтыя дзеянні зробленыя па просьбе пракуратуры РБ у межах справы па расследаванні знікнення аператара ОРТ Завадзкага. На мінулым тыдні была створана адмысловая следчая група па раскрыцці знікненняў вядомых на Беларусі асобаў.

ФЕСТЫВАЛЬ. Беларуская асацыяцыя журналістаў з'яўляецца *«самым даявым звязам Еўропы»*, лічаць у Міжнароднай федэрацыі журналістаў. Пра гэта заявіў прадстаўнік Саюза журналістаў Літвы Вілюс Каваляўскас, выступаючы з прывітаннем ад МФЖ на Першым рэспубліканскім фестывалі незалежнай прэсы. Удзельнікамі фестывалю сталі прадстаўнікі больш за 50 рэдакцыяў недзяржаўных выданняў з Мінску і рэгіёнаў краіны.

СВАБОДА СЛОВА. На мяжы закрыцця апынулася «Новая газета Сморгони» – адзінае ў горадзе недзяржаўнае выданне. 15 лістапада па распараджэнні падатковай інспекцыі, якая незадоўга да гэтага праводзіла праверку дзейнасці газеты, быў замарожаны разліковы рахунак выдання. Кіраўніцтву газеты не дазволілі азнаёміцца з дакументамі, на падставе якіх быў арыштаваны рахунак. Чыноўнікі заяўляюць, што прадастаўляць дакументы толькі галоўнаму рэдактару Рамуальду Улану, які зараз знаходзіцца на стажыроўцы ў Літве.

ПАДТРЫМКА. 15 мільярдаў рублёў яшчэ сёлета атрымаюць прадпрыемствы сельскай гаспадаркі Беларусі з мэтаю падрыхтоўкі тэхнікі да палявых работ. Грошы выдаткоўваюцца плацёжаздольным суб'ектам у межах мэтавага крэдыту пад 25 адсоткаў стаўкі рэфінансавання Нацбанка. Урад краіны канстатуе нездавальняльны стан сельскагаспадарчай тэхнікі.

СТАТЫСТЫКА. Мінстат краіны паведаміў, што за 10 месяцаў бягучага года ў Беларусі аб'ём валавога ўнутранага прадукту павялічыўся на 5%, чым гэтым перыядам летась. Найбольшыя паказальнікі зафіксаваны ў вытворчасці бульбы: у параўнанні з мінулым годам яе сабралі на 51% болей. У той жа час вытворчасць малака зменшылася на 7%, яек – на 2%. На канец кастрычніка індэкс росту спажывецкіх цэнаў склаў 87,3%.



РЭГІСТРАЦЫЯ. Зменены памеры статутных фондаў структур недзяржаўнай формы ўласнасці: калі раней яны вызначаліся «мінімалкамі», то зараз – еўра. Найбольш вялікія сумы статутнага фонда адкрытага акцыянернага таварыства – 12500 эўра, 3000 – закрытага акцыянернага таварыства, 1600 – таварыства з абмежаванай адказнасцю. 150 эўра складае статутны фонд сялянскай (фермерскай) гаспадаркі. Заўважым: найбольш буйным структурам памеры статутных фондаў зменшаныя ў 2–3 разы. Залішне высокія патрабаванні да статутных фондаў былі асноўнай перашкодаю для рэгістрацыі недзяржаўных суб'ектаў гаспадарання. Тэрмін перарэгістрацыі, паводле дэкрэта прэзідэнта, падоўжаны да 1 ліпеня 2001 году.

ХАКЕЙ. У гарвыканкаме Гомеля падпісана распараджэнне аб развіцці хакею. Прадпрыемствы (у прыватнасці, аб'яднанне «Гомсельмаш») абавязваюцца ўзімку абсталяваць у дварах 11 лядовых пляцовак для гульні ў хакей. У Гомелі яшчэ памятаюць сёлетні аўрал з будаўніцтвам паводле ўказу Лукашэнкі лядовага палацу. Тройчы планавалася яго ўрачыстае адкрыццё на самым высокім ўзроўні, але кіраўнік дзяржавы так і не прыехаў. Зараз палац патраліў у цяжкае фінансавае становішча, карыстацца ім не па кішэні ні студэнтам, ні школьнікам.

СПЕЦЗАКАЗ. Магілёўскі ліфтавы завод нядаўна выканаў дужа ганаровую замову – вырабіў спецыяльны ліфт для будынку адміністрацыі прэзідэнта. На жаль, невядомы кошт заказу. Паводле словаў аднаго з завадчанаў, атрымалася практычна ручная праца. Ліфт мусіў стаць нават лепшым за імпартныя: па мяккасці перавозкі, па дызайне, па цішыні ў кабіне.

ЭНЕРГАНОСЬБІТЫ. У выніку дзейнасці новага праекта забеспячэння спажыўцоў прыродным газам, электрычнай і цеплавой энергіяй, многія прадпрыемствы з непарыўным вытворчым цыклам страцяць магчымасць спажывання танных энергарэсурсаў. Колькасць спажыўцоў, якіх ні ў якім разе нельга адключаць ад крыніц энергіі, скароціцца прыкладна на 30 адсоткаў. Паводле новага дакумента, забаронена будзе адключаць ад крыніц энергіі толькі аб'екты з тэхналагічным працэсам. Адначасова энергетыкі за неаплату могуць выключыць электрычнасць у адміністрацыйных будынках. Чакаецца, што новыя нормы набудуць моц на працягу лістапада.

ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ. У Беларусі хутка выйдзе энцыклапедыя «Беларуская міфалогія». Гэта будзе грунтоўная навуковая праца (больш за 700 артыкулаў), дзе сабраны шырокі фактаграфічны матэрыял, прыводзяцца параўнанні са славянскай міфалогіяй. Працавяў над стварэннем энцыклапедыі на працягу двух з паловай гадоў калектыў аўтараў, вядомых навукоўцаў: Ірына Клімковіч, Уладзімір Конан, Эдвард Зайкоўскі і іншыя. Кіраваў калектывам Сяргей Санько. Да працы падключыліся навукоўцы не толькі з розных рэгіёнаў Беларусі, але і з Беласточчыны.

ТРЕТИЙ СЕКТОР

ВЫБОРЫ В СОЮЗЕ ПОЛЯКОВ

Андрей СТАВЕЦКИЙ

18–19 ноября в актовом зале польской школы в Гродно прошел V съезд Союза поляков Беларуси. Задолго до съезда обозначились противоречия между двумя стилями руководства: авторитарным, отождествлявшимся с личностью бывшего председателя Союза Тадеуша Гавина и более демократическим новой команды Юзефа Пожецкого.

С 1990 года бессменным председателем Союза поляков был Тадеуш Гавин. За 10 лет СПБ под руководством Гавина многого добился, это признают даже критики бывшего председателя. Съезд проходил в здании новой польской школы, вклад в строительство которой и лично Гавина, и всего прежнего руководства недооценить нельзя.

Однако авторитаризм Гавина уже давно вызывает недовольство. Первый серьезный конфликт в организации произошел в 1995 году. Возник даже скандал, тогдашнего вице-председателя Станислава Сенкевича исключили из организации.

Привычка все решать самому вызвала представление у части членов СПБ о незаменимости Гавина. Его решение об уходе в отставку с мотивировкой «по состоянию здоровья», которое было удовлетворено правлением СПБ 5 июля этого года, для многих стало полной неожиданностью. Исполняющим обязанности председателя СПБ стал Юзеф Пожецкий. Тут-то и рухнул миф о незаменимости бывшего председателя. Оказалось, что и другой человек в состоянии руководить организацией и может делать это не хуже Гавина.

Отличительной чертой сложившейся ситуации было то, что с марта этого же года тогда еще председателю Гродненского областного отделения СПБ Юзефу Пожецкому запрещен въезд на территорию Польши. *«Такими были указания польских спецслужб, это лицо нежелательно в Польше по причине безопасности страны»*, – так ситуацию с Пожецким прокомментировал на страницах газеты *Kurier poranny* анонимный представитель польских пограничников.

Пожецкий, считая свой невыездной статус недоразумением, какой-то бюрократической ошибкой, не спешил «выносить сор из избы», одновременно прилагая максимум усилий для решения вопроса с отменой запрета на въезд. В Польше его усилия натыкались на непробиваемую стену.

Одновременно стали появляться слухи, что свою кандидатуру на пост председателя СПБ намерен выставить и подлечившийся Тадеуш Гавин. Именно с этого момента предвыборная дискуссия стала резко набирать температуру. Особенно отличился орган СПБ *Glos z nad Niemna*. Главный редактор газеты полностью был заангажирован в предвыборной борьбе. За несколько дней до съезда свою лепту в дискуссию внесли и газета *«Пагоня»*, перепечатавшая статью из польской газеты *Kurier poranny*, и орган облисполкома «Гродненская правда», опубликовавший под рубрикой «письмо в редакцию» статью никому в СПБ неизвестного Ежи Кручиньского.

С момента открытия съезда в зале чувствовалась крайне напряженная атмосфера. Однако настоящая буря поднялась во время дискуссии по кандидатурам, выдвинутым на пост председателя СПБ. Два наиболее вероятных кандидата – Пожецкий и Гавин – сняли свои кандидатуры. В результате председателем СПБ был избран профессор Гродненского университета Тадеуш Кручковский, за которого свои голоса отдали 174 делегата. В выборах принимал участие также известный граф Прушинский, но, как и на президентских выборах, удача была не на его стороне. Он получил всего лишь 6 голосов.

Несмотря на все пророчества, раскола не произошло. Теперь все зависит от того, сможет ли новая команда преодолеть нездоровую ситуацию внутри организации и наладить совместную работу со всеми ее членами, переступая таким образом через личные симпатии и антипатии. Первые шаги в этом направлении сделаны уже на съезде – восстановлено членство в СПБ Станислава Сенкевича.

ПРОВИНЦИЯ

Стекловары протестуют

Александр СДВИЖКОВ

Когда-то Борисовский стеклозавод носил имя Ф. Дзержинского и выпускал ужасно дефицитную хрустальную тару. Тогда борисовские стекловары на доходы не жаловались. Главное – вынести и вывести за проходную. А там дефицит всегда находил сбыт.

Ныне на борисовский хрусталь спроса нет. Нет и былых доходов. Был завод хрустальным – стал стеклянным. У проходной уже не топчется бдительная вохра. Там теперь толпятся пикетчики и проходят митинги стеклозаводцев.

После долгих ноябрьских выходных на Борисовском стеклозаводе созрели гроздья гнева. В нескольких цехах стеклозавода началась стихийная стачка. Стеклозаводцы и раньше знали, что на их зарплату жить нельзя. Даже в самых горячих цехах она не превышает 40 тысяч новыми. Но и это, столь мизерное денежное довольствие, администрация стала регулярно задерживать. В то время как заводское начальство себя не обижает и, где можно, приторговывает стеклом. Куда и по какой цене отгружается продукция, рабочим неведомо.

Недовольством стеклозаводцев не преминули воспользоваться борисовские социал-демократы. 20 ноября они встали в пикет у заводской проходной с плакатом *«Социал-демократы знают о проблемах стеклозаводцев»*. Милиция несанкционированную акцию не пресекла. Наверное, не хотела накалять обстановку.

21 ноября в обеденную пересменку у ворот стеклозавода состоялся митинг. В течение часа кипел возмущенный разум представителей двух заводских смен. Собралось там по меньшей мере полтысячи стеклозаводцев. Они дружно освистали замдиректора завода.

Появились и стражи порядка. После обычной дискуссии о незаконности мероприятия они заголкали в милицейский «уазик» ведущего борисовского демократа Александра Абрамовича. Но не тут-то было – рабочие возмутились и вызволили Абрамовича. После этого милиция уже совершенно не вмешивалась. Напротив, замначальника ГОВД убрал с народных глаз долой какого-то милицейского вояку, выскочившего к протестующим с автоматом.

Тем временем Александр Абрамович поднял плакат *«Социал-демократы поддерживают стеклозаводцев»* и повел несколько сотен манифестантов к городской мэрии. Борисовский вертикальный градоначальник В. Бургун от рабочих куда-то скрылся. За него пришлось отдуваться бессменной горисполкомовской управленцами Т. Дроновой.

Такого в Борисове не бывало с апреля 1991 года. Тогда на той же самой площади состоялся рабочий митинг 5 забастовавших заводов. И безо всяких последствий.

Теперь все несколько не так. Александр Абрамович объявлен зачинщиком беспорядков, милиция его ищет, чтобы оштрафовать на 10 суток административного ареста. А на стеклозаводе собираются увольнять своих смутьянов.

ПАЛАТА № 2

Галоўнае – навык!

Таццяна ПАПОВА

Упершыню за апошнія чатыры гады паседжаньнем палатнікаў кіраваў не Малафееў.
21 лістапада месца на трыбуне ў Круглай залі Нацсходу заняла старшыня Цэнтрвыбаркаму Лідзія Ярмошына. Яна раскручвае свой імідж сур'ёзнае жанчыны, таму першая сэсыя Палаты прадстаўнікоў пачалася ня дужа весела.

Бальшыня цяперашняга складу Палаты прадстаўнікоў даведалася аб сваім новым статусе больш як месяц таму. За гэты час можна было аблазіць увесь Дом ураду, ці, прынамсі, правесці глябальныя дасьледзіны самое Круглае залі. Апынулася ж, што дэпутатам, нават тым, што маюць навуковыя ступені, усё трэба тлумачыць, як малым дзецям. Дужа ж лёгка забылятацца ў хітрыках функцыянаваньня элекронае сыстэмы галасаваньня.

Пасьля падрабязных інструкцый аб тым, як і калі трэба націскаць на адзіную кнопку на працоўным месцы, прадстаўнікам прапанавалі на практыцы замацаваць толькі што набыты навык. З 91-го зарэгістраванага, па зьвестках Ярмошынай, дэпутата, з заданьнем справіліся толькі 74. Пасьля паўторнае просьбы старшыні паседжаньня зарэгістраваць, на электронным табло заміргацела лічба 95. Пэўне, двоечнікі, каб выправіць свае памылкі, націскалі на кнопачкі на суседніх пультах.

Кали новенькія трошку асвойталіся ў залі, з прывітальнай прамовай да іх зьвярнуўся Лукашэнка. Ён кораценька адзначыў бліжэйшыя пэрспэктывы заканатворчасьці для прысутных у залі. Ад палатнікаў чакаюць прыняцьця шматпакутнага закона аб зброі, адміністратыўнага, падаткавага й крымінальнага кодэксаў. Асабліваю ўвагу ў працы над апошнім дакумэнтам Лукашэнка папрасіў зьвярнуць на пытаньні адказнасьці для тых, хто інфармуе незалежныя СМІ аб фактах, скіраваных на дыскрэдытацыю дзяржаўнае ўлады. Інтэграцыйныя памкненьні кіраўніка дзяржавы вымагаюць крэатыўных высілкаў па ўніфікацыі існуючага ў Беларусі закнадаўства з расійскімі нормамі.

Дэпутацтву давядзецца ўзяць на сябе й цяжар адказнасьці за будучыя паразы ў барацьбе за рэнтабельнасьць агра-прамысловага комплексу. Лукашэнка ад пачатку заявіў, што не дазволіць *«падзяліць зямлю на кавалкі й пасадзіць на кожным кавалку па фэрмэры»*.

Лукашэнка згадаў, што некалі абмовіўся аб магчымым пашырэньні паўнамоцтваў свайго заканадаўчага воргану. Пакуль ён не адчувае пільнае патрэбы прапісваць 97-ы артыкул канстытуцыі. Прэзыдэнт падкрэсьліў асаблівую важнасьць непарушэньня дужа ўдалага балянсу, што ўсталяваўся паміж галінамі ўлады.

Захаваньню гэтае збалянсаванасьці будзе спрыяць новы дэпутацкі начальнік Вадзім Папоў. 76 новаабраных дэпутатаў аддалі свае галасы за прапанаванага прэзыдэнтам кандыдата на старшыньства ў палаце й толькі 17 не адступіліся ад сваёй прыхільнасьці Кучынскаму.

ПО ПОВОДУ

ЗАЧЕМ ЛУКАШЕНКО ТЕРРОРИСТЫ?

Страшилка Корчинского — лидера украинской группы *«Щіт Батьківщіни»* — заслать в Беларусь террористов для диверсий на газопроводах стала для Лукашенко подарком к октябрьским. Две недели кряду Козиятко, Зимовский, Азаренок без конца стращали зрителей БТ шароварными динамитчиками, прячущими гексоген в котомках с салом.

Ситуацию комментирует независимый украинский политолог Юрий Славин.

Батька Корчинский призывает записываться в свою организацию

Из Украины навязчивый страх белорусского президента перед Корчинским кажется самогипнозом. Либо у белорусских спецслужб совершенно не налажен мониторинг по Украине, либо просто ваши власти из собственных интересов нагнетают террористическую истерию.

Корчинскии занимается банальной политической саморекламой и раздуванием собственной значимости. Еще в 1991 году в аппарате Службы безопасности Украины решили, что неплохо было бы собрать весь экстремистский шлак под одну крышу, чтобы легче контролировать эту публику. Кроме того, их активно использовали за границей в щепетильных акциях, где официальному Киеву лучше было не светиться.

Вряд ли вы прочитаете про это в мемуарах Корчинского, но вот вам один лишь факт: унсовские волонтеры в 1992 году доставлялись в Абхазию на самолетах МО Украины, а после проходили реабилитацию в военных госпиталях.

За пять лет в украинской элите произошли коренные изменения. Вследствие приватизации российский капитал переподчинил себе несколько секторов украинской экономики. У нас влиятельнейшее пророссийское лобби. Проворачивать такие масштабные акции, как подготовка и заброска террористов в Беларусь, можно лишь с санкции Кремля.

Произошла и смена ипостасей УНА-УНСО. Без протеже СБУ она стала достаточно заурядной праворадикальной тусовкой, которая в быту занимается тем, что пикетирует гастроли Бориса Моисеева. *«Щіт Батьківщіни»* Корчинского тоже не стоит на службе украинского Левиафана. Он является структурой, нуждающейся в промоушэне пристойной правоцентристской партии *«Батьківщіна»* господина Турчанова – наследника экс-премьера Лазаренко.

Не так давно группа молодых интеллектуалов предложила Турчанову проект второго издания УНСО: создание при *«Батьківщіні»* секции, которая могла бы эпатажно раскручивать имя партии в СМИ. Для этого и выписали Корчинского.

Корчинский маялся тем, что вел передачу «Уроки постмодерна» на канале БТАР и колонку в «Вечерних вестях», клепал проченческие сайты. Про него уже стали забывать, поэтому он с готовностью принял выгодное коммерческое предложение Турчанова.

Чтобы вытянуть имя *«Батьківщіни»* на первые полосы газет, он склонен делать самые шокирующие заявления. Например, после аварии на Курске, Корчинский поделился секретом, что гибель подлодки – диверсия его агентов, проникших в структуры российской обороны. Путин никак не отреагировал на такую глупость: у него под рукой всегда есть миф о чеченской угрозе, которую при необходимости можно реанимировать, чтобы оправдать любые авторитарные мероприятия.

У вашего Лукашенко, видимо, в этом плане напряженка. Вот и приходится Минску выдавать фальсификации Корчинского за чистую монету.

ПО СТРАНАМ И КОНТИНЕНТАМ



ЯПОНИЯ. Уникальный случай в рядах всегда единых либерал-демократов. Лидер ЛДП Коичи Като открыто требует смещения партайгеноссе премьера Йоширо Мори. Като – адепт тэтчеризма – обвиняет Като в саботаже либеральных реформ.

ЕГИПЕТ. Национально-демократическая партия президента Мубарака впервые за последние десять лет с трудом сохранила большинство в египетском парламенте. Только благодаря 216 независимым кандидатам фракция НДП получила 88 процентов мест. По сравнению с 1995 годом, когда партия Мубарака имела абсолютное большинство (97 %), на нынешних выборах национальные демократы потеряли 145 мест. Зато «Братья-мусульмане» получили 17 мест, что можно считать значительным успехом. Ибо на предыдущих выборах они вообще не вошли в парламент, а в 1990 году бойкотировали выборы. В целом же оппозиция будет представлена в нынешнем законодательном органе Египта 54 депутатами, что в 4 раза превышает их предыдущий результат.

ШОТЛАНДИЯ. Шотландская национальная партия приняла решение добиваться выхода региона из стерлинговой зоны и введения евро в качестве шотландской национальной валюты.

БОСНИЯ. Алия Изетбегович – уже бывший лидер Боснии. Пять лет спустя после подписания дэйтоновских соглашений его партия проиграла выборы социал-демократам в мусульманском секторе. В сербском секторе у власти осталась партия Радована Караджича СДС.

США. По решению суда Атланты, компания *Coca Cola* обязана выплатить 192 миллиона долларов своим чернокожим служащим. Доказано, что администрация фирмы тормозила карьерный рост афроамериканцев.



ФРГ. Министр транспорта ФРГ, эсдек Рейнхард Климмт, покинул свой пост из-за футбольных симпатий. В 1996 году, будучи чиновником аппарата правительства земли Саар, он принудил католического епископа Каритаса выложить 620 000 DM на поддержку любимой футбольной команды.

ЕВРОСОЮЗ. На встрече министров обороны стран, входящих в Евросоюз, 20 ноября в Брюсселе были определены квоты на формирование европейского корпуса быстрого реагирования. Решение о создании этого корпуса было принято еще в декабре 1999 года на встрече в Хельсинки. Корпус предполагается создать к 2003 году. Он будет состоять из 100 тысяч человек, 350 боевых самолетов, 80 кораблей. В его задачи будет входить проведение гуманитарных операций, эвакуация беженцев, сохранение мира в европейском регионе. Основную часть корпуса быстрого реагирования обязались сформировать: Франция (20 тысяч), ФРГ (13,5 тысяч человек), Великобритания (12,5 тысяч), Италия (6,5 тысяч).

ЯПОНИЯ. В японской глубинке арестована Фузака Шигенобу. Фузака – легендарная предводительница террористов из «Красной армии» (Секигун-ха). На ее совести серия терактов, включая глобальную бойню в аэропорту Тель-Авива в 1972 году (26 убитых).

КИТАЙ. Власти Китая официально начали поход против преступного синдиката, называемого триады, что базируется в Гонконге. Триады были созданы еще в 1647 году как подпольная антиманжурская крестьянская организация, позже выродились в уголовников и теперь, как боятся в Пекине, на волне реформ могут распространиться по всей Поднебесной и повторить успех российских солнцевских.

ФРАНЦИЯ. Каждый второй француз решил стать вегетарианцем. Все из-за дюжины буренок, чье мясо дало положительный тест на вирус губчатого энцефалита. Коровий кризис ширится и грозит вылиться в политический. Фермеры пообещали заблокировать итальянскую границу, если Рим не отменит эмбарго на ввоз гальской говядины.

ПОДРОБНОСТИ

Азиатский форум

Игорь ВОЛЯНИК

Бандар-Сери-Бегаван, столица Брунея — крошечного, но очень богатого государства в Юго-Восточной Азии — является местом проведения саммита глав 21 государства, что входят в ассоциацию «Азиатско-Тихоокеанского экономического сотрудничества» (АТЭС).

Главы приглашенных государств бурно дебатировали по поводу дальнейших темпов либерализации мировой торговли – проблемы, затрагивающей интересы всех, причем не только в Азии.

По итогам саммита была принята декларация, в которой затрагивались проблемы глобализации и подчеркивалась необходимость доступа к ее благам как можно большего числа народов Азии. Ставка делается на Интернет, число пользователей которого планируется к 2005 году значительно увеличить, особенно расширив его применение в области электронной торговли. Кроме того, было решено допустить Северную Корею к деятельности рабочих групп АТЭС, а также поддержать Россию и Вьетнам в их стремлении вступить в ВТО.

Яблоком раздора в дружном семействе по-прежнему является проблема либерализации импорта. Япония и Южная Корея, поддержанные большинством других участников собрания, выступили резко против открытия своих рынков для широкого потока американских и европейских товаров.

Набирающая обороты мировая глобализация, активными адептами которой являются и страны Азиатско-Тихоокеанского региона, сталкивается на своем пути с определенными трудностями. Интернационализация мирохозяйственных связей требует от все большего числа государств делиться своим суверенитетом в пользу наднационального управления экономическими процессами. Ставится проблема преодоления традиционной государственности. Глобализация, таким образом, подразумевает развитие экономического и политического взаимодействия стран и регионов мира до такой степени, когда становится возможным постановка вопроса о создании единого мирового правового и информационного поля, а также неких мировых органов экономического и политического управления.

Однако вопрос о том, будет ли новый мировой порядок справедливым для стран, не входящих в клуб богатых и избранных, остается открытым. Противоречия между богатыми и бедными странами третьего мира по линии Север – Юг усиливаются, колоссальная пропасть в доходах и уровне жизни кажется непреодолимой.

Азия со своей стороны пытается осторожно нащупать собственный путь интеграции в мировое сообщество, ибо изоляция и автократическая модель развития будут в любом случае означать консервацию собственной отсталости на длительный срок. А упущенное время сейчас – это потерянные деньги потом.

На вызовы времени Азия отвечает поисками модели собственной интеграции. Стремление к азиатской консолидации подстегнул разразившийся в 1997 году финансовый кризис, который вызвал обвал валютных и фондовых рынков Таиланда, Филиппин, Малайзии, Индонезии и Южной Кореи.

Кризис вызвал тяжелые социально-экономические последствия в этих странах, а в Индонезии произошла настоящая народная революция, где в результате массовых беспорядков вынужден был подать в отставку диктатор Сухарто, правивший страной как собственным концерном на протяжении тридцати лет. Во многих странах прошли также погромы и убийства представителей *«предпринимательских меньшинств»*, в частности китайцев.

Одним из последствий финансовой бури в Азии стало усиление страхов по отношению к процессам глобализации, происходил также рост антизападных настроений как реакция на унизительные просьбы оказать помощь, от которой, впрочем, никто не отказывался.

На этом фоне идеологи паназиатизма стали усиленно ратовать за консолидацию азиатских народов на расовой основе и создание собственных форм социальной и экономической мобилизации. Премьер-министр Малайзии Мохаммед Мохатхир, вступивший в бурную перепалку с Джорджем Соросом, обвинил Запад в стремлении экономически подорвать Азию, чтобы не допустить появления мощного соперника и конкурента на мировой арене.

В регионе объективно происходит соперничество за лидерство между США, Японией и Китаем. Некоторые исследователи даже запустили в научный оборот метафору, что со временем *«ветер с Востока одолеет ветер с Запада»*. Подобные оптимистические прогнозы строились на фоне впечатляющих экономических успехов стран Юго-Восточной Азии, особенно Китая.

Экономическая модернизация в странах данного региона не всегда сопровождалась политической. На горизонте появилась угроза патерналистского азиатского авторитаризма на капиталистической основе (в качестве примера брался образ будущего Китая), который бросает вызов Западу. При этом азиатская альтернатива представляет собой построение общества не на основе прав индивидуума, а на основе глубоко укоренившихся моральных кодексов поведения и религиозной традиции. Тем не менее, вероятность контрнаступления альтернативных проектов восточных цивилизаций маловероятна.

В данный момент в Азии вряд ли возможно появление каких-либо антиамериканских союзов и альянсов. Никто из активных игроков в регионе не располагает достаточными ресурсами, технологиями и возможностями для того, чтобы оспорить лидерство США. Действуя по уже сложившимся правилам игры, большинство стран АТР вынуждены подчиняться безликой экономической власти международных институтов, контролируемых Западом.

Китай предпочитает проводить взвешенную и прагматическую внешнеполитическую линию в регионе, предпочитая химерам *«антигегемонистских»* альянсов прочное и долговременное торгово-экономическое сотрудничество с США и ЕС, а также членство во Всемирной торговой организации. По всей видимости, Китаю предстоит пройти долгий путь согласования своих интересов и представлений о глобализации с интересами развитых стран. Кроме того, экономическое взаимодействие стран региона в рамках АТЭС строится преимущественно вокруг американских, японских и тайваньских ТНК. Хотя процесс институализации АТЭС идет крайне медленно и осложняется торговыми трениями и конкуренцией между его членами.

Шансом для стран Азиатско-Тихоокеанского региона вырваться из порочного круга своих социально-экономических проблем является дальнейшее активное участие в процессах глобализации с сохранением своей культурной специфики и самоидентификации.

Экономическая интеграция в азиатских странах не сможет обойтись без широкого привлечения зарубежных инвестиций, технологий и повышения степени открытости национальных экономик. Сегодня ни одна из стран мира не в состоянии решать собственные проблемы развития без участия в многосторонних связях с другими государствами.

ВАНДРОЎКА

ДЫПЛЯМАТЫЧНАЯ МІСЬЯ

Таццяна ПАПОВА

Беларускія дэмакраты скарыстоўваюць адносна спакойны міжвыбарны перыяд для ўмацаваньня сувязяў з міжнароднай супольнасьцю. У другой дэкадзе лістапада прадстаўнікі беларускае апазыцыі зьдзейсьнілі экспрэс-падарожжа па Эўропе.

Знакаміты экс-генсек НАТО Хав'ер Салана сустрэўся зь беларускай апазыцыяй

Накіроўваючыся ў вандроўку, Вінцук Вячорка, Аляксей Кароль, Анатоль Лябедзька й Андрэй Саньнікаў мелі на мэце распавесьці эўрапейскім палітыкам аб становішчы ў Беларусі напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў. Замежнікі хацелі пачуць меркаваньні, уласьцівае апазыцыі нагул, а не прадстаўнікам КРДС у прыватнасьці. Таму кожны зь беларускіх дэлегатаў меў перспанальнае запрашэньне.

Сярод асабліва значных падзей шасьцёхдзённага падарожжа ваяжэры адзначаюць сустрэчы з прадстаніком дэпартамэнту МЗС Францыі па Ўсходняй Эўропе спадаром Шыбаефым, прадстаўніком Эўракамісыі па зьнешняй палітыцы Крысам Патэнам і вярхоўным прадстаўніком Эўразьвязу па пытаньнях зьнешняе палітыкі й бясьпекі Хав'ерам Саланам. З асаблівай пяшчотай адгукнуліся дэлегаты аб доўгай і грунтоўнай размове з былым амбасадарам ЗША ў Беларусі Дэвідам Спэкхардам.

Усе прадстаўнікі эўраструктураў апынуліся вельмі добра інфармаванымі аб цяперашняй сытуацыі ў Беларусі й надзвычай непакоіліся аб перспэктывах яе разьвіцьця. Іх цікавілі безьліч нюансаў перадвыбарнае тактыкі беларускае апазыцыі, зьнітаваных з рашэньнем вылучаць на прэзыдэнцтва адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл. Усе суразмоўцы беларускіх дэлегатаў выказвалі ўпэўненасьць, што перамога на выбарах кандыдата ад апазыцыі пацягне за сабой дэмакратычныя зьмены ў нашым гармадзтве.

Эўрапейцы прасілі абгрунтаваньня здольнасьці дэмакратаў сабраць 100 тысяч подпісаў у падтрымку свайго вылучэнца за два тыдні. Перадумовай ажыцьцяўленьня задуманага ёсьць абсалютная арганізаванасьць апазыцыі. Не зашкодзіць яна й у супрацьстаяньні спробам улад нэйтралізаваць кандыдата ад дэмакратычных сіл Беларусі. Замежнікі ўпэўненыя, што беларускія ўлады, маючы дастатковы досьвед фальсыфікацый у часе выбараў, здольныя выкарыстаць сваё майстэрства зноў. Насьцярожанасьць эўрапейцаў была выклікана таксама й прыкладамі расколу апазыцыі. Беларускія дэлегаты аднагалосна заявілі, што яны здольныя ігнараваць правакацыі ўладаў, бо за гады свайго існаваньня ў кіруемай Лукашэнкам дзяржаве навучаліся не паддавацца на ягоныя хітрыкі.

На ўсіх сустрэчах ў часе падарожжа па Эўропе згадваліся наступствы перапыненага тэрміну даверу. Заканчэньне адносна мірнага суіснаваньня ўлады й апазыцыі адзначылася разгонам моладзевае акцыі «За перамены»12 лістапада. Дэлегацыя беларускіх апазыцыянэраў прапанавала эўрапейцам праявіць увесь свой палітычны ўплыў, каб не дапусьціць якога-кольвечы ціску на альтэрнатыўных ўладам прадстаўнікоў часткі беларускага грамадзтва.

Надзвычай важнай тэмай, узнятай у часе перамоў, стаўся ўплыў расійскага фактару на палітычныя працэсы ў Беларусі. Вячорка, пераказваючы словы нямецкага канцлера-дэмакрата Крыстафа Цопэля, заявіў, што Нямеччына адмовіцца ад партнэрства з Расіяй у галіне абароны, калі тая будзе падтрымліваць недэмакратычны рэжым у Беларусі. Расія, па агульным меркаваньні беларускіх і эўрапейскіх дэмакратаў, мусіць захоўваць нэйтралітэт. Лідэр БНФ упэўнены ў надзвычайнай цяжкасьці дасягненьня «скансалідаванае пазыцыі Эўропы й Расіі па беларускім пытаньні». Тым ня менш, калі Расія зьбіраецца разьвіваць стасункі з Эўразьвязам, дык яны павінны грунтавацца на дэмакратычных прынцыпах.

Надзвычай плённым апынуўся візыт беларусаў у Бэрлін. На сустрэчы з парлямэнтарамі Бундэстагу прысутнічаў сталы экспэрт па беларускім пытаньні Вольфганг Бэрэндт й міністар замежных спраў Нямеччыны Крыстофэль Цопэль. У Бундэстагу апошні прадстаўляе фракцыю сацыял-дэмакратаў. Таму праблемы беларускіх эсдэкаў, зьнітаваныя з разыходжаньнямі ў тактыцы ўдзелу ў парлямэнцкіх выбарах, выклікалі яго асаблівую цікавасьць.

Лейбарыст Эндру МакКінт вітае сацыял-дэмакрата Аляксея Кароля

На радзіме парлямэнтарызму беларускіх візытэраў віталі ня толькі сацыял-дэмакраты на чале з Майклам Трэндам, але й лейбарысты ў асобе Эндру МакКінлі.

У склад дэлегацыі Эўрапейскага парлямэнту, зь якой сустракаліся беларусы, уваходзіў Ян-Марынус Версма. У часе размовы прагучала думка аб тым, што Лукашэнка, магчыма, згубіў апошні шанец на легітымізацыю сваёй улады. Далейшыя дачыненьні гэтае структуры зь Беларусьсю будуць грунтавацца на факце непрызнаньня парлямэнцкіх выбараў. Колькасьць базавых умоў для прызнаньня законнасьці прэзыдэнцкіх выбараў скарацілася да трох. Бакі ўсьведамілі, што пашырэньне функцыяў парлямэнту апынешца намінальным і не прывядзе да дэмакратызацыі цяперашняе сытуацыі ў Беларусі.

Прадстаўнік Эўракамісіі па зьнешняй палітыцы Крыс Патэн задаволены новым знаемствам

У часе гутаркі закраналіся пытаньні эканамічнага разьвіцьця Беларусі ў перспэктыве, а гэтаксама надзённыя праблемы нашае эканомікі. Замежнікі станоўча адрэагавалі на факт наяўнасьці распрацаванае камандай Мечыслава Грыба канцэпцыі эканамічнага рэфармаваньня, але па суткасьці гэтае праграмы не выказваліся. Яны спыталіся аб падрабязнасьцях будаўніцтва на тэрыторыі нашае рэспублікі новых нітак газапроваду «Ямал – Эўропа» і засталіся задаволеныя станоўчай ацэнкай дэлегацыі ўсіх праектаў, што здольныя палепшыць жыцьцё іх суайчыньнікаў.

28 лістапада мае адбыцца сустрэча міністраў замежных спраў эўрапейскіх краін з АБСЭшнікамі. Бакі ўпершыню пасьля парлямэнцкіх выбараў узьнімуць беларускае пытаньне. Да ўдзелу ў пасяджаньні парлямэнцкае асамблеі АБСЭ запрошаны А. Лябедзька як дэпутат Вярхоўнага Савету 13-га склікання. Нікога зь цяперашніх нацсходаўцаў на сустрэчы ня будзе.

РЭДАКЦЫЙНЫ КАМЕНТАР

Гэты візыт прадстаўнікоў дэмакратычнае апазыцыі ў Эўропу можна лічыць дыпляматычнай місыяй, адной з тых, на якія зьнешнепалітычныя ўстановы Беларусі ўжо забыліся па сваёй ўласнай віне, па выніках тае палітыкі самаізаляцыі, якую праводзіць рэжым Лукашэнкі. Дэмакратычная апазыцыя бярэ на сябе задачу стасункаў Беларусі з навакольным сьветам. Дзякуючы сувязям апазыцыі, падтрымліваецца кантакт Беларусі з усясьветнай супольнасьцю.

У замежжы ведаюць менавіта аб дэмакратычнай Беларусі. Гэты візыт падзіўся ў межах агульнае палітыкі апазыцыі за дэмакратычныя перамены з разьлікам, што рэжым сьцізе ў нябыт, а Беларусь, як суб'ект міжнароднае палітыкі, застанецца. Усе гэтыя кантакты апынуцца канкрэтнай карысьцю для народа Беларусі. Наша краіна не можа жыць і разьвівацца без інвэстыцыяў, бо гэта працоўныя месцы, нармальная зарплата і асноўная перадумова росквіту нашае эканомікі.

Пасьля выбараў у Палату прадстаўнікоў чальцы Эўрагройкі яшчэ не сустракаліся памiж сабой. Гэта надала цікавасьці іх сустрэчы з прадстаўнікамі дэмакратычных сіл Беларусі. Замежнікі ўважаюць, што яны свой абавязак перад эўрапейскай дэмакратычнай супольнасьцю выканалі. Яны заявілі аб непрызнаньні легітымнасьці выбараў, абапіраючыся на дакладную аб'ектыўную інфармацыю. Іх непакоіць, асабліва пасьля апошніх падзеяў у Югаславіі, тое, што ў Эўропе застаўся апошні дыктатарскі рэжым.

Шчырую зацікаўленасьць эўрапейцаў выклікалі нашыя паведамленьні аб тактыцы аб'яднаных дэмакратычных сілаў па вылучэньню адзінага кандыдата. Яны заклікаюць ўлады аднавіць перамовы з апазыцыяй, каб правесьці свабодныя прэзыдэнцкія выбары.

Калі далучаешся да ўзроўню такое эўрапейскае палітыкі і адначасова глядзіш на жыцьцё адзінае Эўропы, дзе межы саступаюць досьціжэньням (хуткасныя цягнікі й самалёты скарачаюць прастору да адлеглясьці працягнутае рукі), дык узмацняецца ўпэўненасьць у слушнасьці абранага шляху дэмакратычных пераўтварэньняў у Беларусі. Прыходзіць разуменьне таго, што толькі зьвязваючы свой лёс з Эўропай, Беларусь можа дасягнуць росквіту, а насельніцтва атрымаць нармальныя ўмовы жыцьця. Міжволі ўзьнікае думка: гэта ж як трэба любіць уладу, каб адмовіцца ад такое палітыкі! Я маю на ўвазе Лукашэнку. Замаж таго, каб стаць фігурай у эўрапейскай палітыцы, ён наведаваў толькі хаўрусьнікаў-дыктатараў ва ўсходніх краінах. Ён застаецца фігурай толькі ў вялікім калгасе, нават не дзяржаве, пад назовам Беларусь. Ягоны лёс – ізаляцыя на ўласным падворку.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

Добрыя намеры, але...

Новы склад Палаты прадстаўнікоў не вызначаецца сваёй разнастайнасьцю. Асноўную яго частку складаюць прызначэнцы ад улады. Зусім невялікую катэгорыю ўтвараюць заможныя прадстаўнікі, якія па ўсіх правілах перадвыбарнае кампаніі ўлагоджвалі сваіх выбаршчыкаў не пяцёххвілінныміскарагаворкамі ў праграме «Выбары-2000», а рэальнай грашовай дапамогай. Адным з прагматычных мэцэнатаў стаўся беларускі кароль газіроўкі Ўладзімер Дзялендзік.

Зь ім і гутарыць наш карэспандэнт Тацьцяна Папова.

– Як вы ацэньваеце крэатыўны патэнцыял тых людзей, што сабраліся сёньня ў Палаце прадстаўнікоў?

– Я ўжо трошкі пазнаёміўся з прадстаўнікамі Менскае й Гарадзенскае вобласьці, а таксама гораду Менску. На маю думку, у новым парлямэнце апынуліся людзі дастаткова адукаваныя й працаздольныя. То бок, такога, што было ў старой Палаце прадстаўнікоў, больш ня будзе. Асабістае маё меркаваньне, што будуць выпрацоўвацца ўжо нармалёвыя законы.

– Якія законы, на вашую думку, трэба прымаць у першую чаргу?

– У дэпутатаў ёсьць розныя меркаваньні. Некаторыя зь іх хочуць перадусім прыняць закон аб дэпутацтве. Я не прыхільнік гэтага. Маё меркаваньне: трэба сёньня правесьці рэвізыю законаў, распрацаваных мінулым парлямэнтам. Калі мы гэтага не зробім, калі парлямэнт пойдзе іншым шляхам, грош цана будзе нам. Я б адразу вырашаў эканамічныя праблемы. Але справа ў тым, што ёсьць шмат законаў, якія ўжо цяпер нас чакаюць. Іх трэба прымаць тэрмінова.

Важнейшым жа пытаньнем цяпер апынулася падаткавае заканадаўства. Каб людзі маглі зарабляць, а прамысловасьць працаваць нармальна. Калі эканоміка ня будзе працаваць, ня будзе сёньня нічога ў рэспубліцы. Якія б законы сёньня не стваралі іншыя, нават калі прыняць закон аб крымінальным праве, дык калі не будзе добрае нарматыўнае эканамічнае базы, то будуць зьдзяйсьняцца недарэчныя эканамічныя злачынствы.

– Якія ж хібы ў цяперашнім падаткавым заканадаўстве? Чаму яго трэба мяняць?

– Сёньня ўсе бугальтэрыі, падаткавыя інспэкцыі, усе правяраючыя органы самі могуць заблытацца ў падаткавым заканадаўстве. Таму яго трэба спрасьціць. З 17 розных відаў зборaў зрабіць 10. Міністэрства фінансаў няхай разьмяркуе, якім чынам зьбіраць астатнія 7 падаткаў. Гэта дазволіць не пашыраць штат інспэктараў, якіх цяпер недастаткова і стане стымулам каб слушна налічваць падаткі. Не будзе шматлікіх штрафных санкцыяў і розных іншых рэчаў, ад якіх прадпрыемствы сёньня пакутуюць.

Варта таксама паставіць пытаньне аб зьніжэньні падаткавага цяжару хаця б адсоткаў на 10 з усіх прадпрыемстваў. Гэта паспрыяе разьвіцьцю прадпрыемстваў, павялічэньню працоўных месцаў. Сёньня зваротных сродкаў на прадпрыемствах практычна няма. Шмат якія прадпрыемствы жывуць толькі для падаткаў і заробкаў. Вы спытаеце, як напоўніць бюджэт? Я прыхільнік таго, што трэба ашчадней траціць грошы на рамонт міністэрстваў і ўстаноў. Не трэба гэтых эўрарамонтаў.

Ёсьць таксама й іншыя сродкі напаўненьня бюджэту. Я б увёў экалягічны падатак для пастаўнікаў у Беларусь шкодных для краіны рэчываў. Гэта ў прыватнасьці плястмаса, плёнкі й г. д. Гэта забруджвае нашу краіну. Паступленьні ад гэтага падатку практычна перакрыюць дзесяцігадкатковы недахоп сродкаў ад прадпрыемстваў. Так, мне могуць заявіць працаўнікі гандлю, што адбудзецца падаражаньне некаторых тавараў. Калі казаць умоўна, пакункі зь селядцом стане вазіць даражэй. Прадукцыя падаражэе нязначна, але гэта абарона свайго рынку, грошы зьявяцца і на перапрацоўку адходаў, і на іншае. Ва ўсялякім выпадку, я гэтую пазыцыю буду бараніць перад урадам, бо пад гэтым ёсьць эканамічны грунт.

Любое прадпрыемства, дайце яму зваротныя сродкі, будзе закупаць абсталяваньне, будаваць новыя вытворчыя плошчы. Гэта будзе прыцягненьне новае працоўнае сілы. За паўгода павялічыцца паступленьне грошай у бюджэт у некалькі разоў. Тады прадпрыемства будзе разьвівацца.

Нават на прыкладзе свайго прадпрыемства: калі ў мяне ёсьць свабодныя грошы, я пашыраю вытворчасьць, я павышаю свою магутнасьць. Адпаведна, у бюджэт я адлічваю болей. За кошт чаго я прыцягваю гэтыя сродкі? Зараз я пазычаю ў замежнікаў абсталяваньне й пакрысе зь імі разьлічваюся. А калі б у мяне былі свае зваротныя сродкі, я б хутчэй разьвярнуўся. З гэтых пазыцый я буду адстойваць падаткавае заканадаўства. Трэба даць беларускім прадпрыемствам ачомацца. Сёньня, калі казаць шчыра, 70 адсоткаў асноўных фондаў зношаныя. Мы ідзем да таго, што праз якісьці час ня будзе чым выпускаць ні толькі машыны, але й ўсё астатняе. Нашую рэспубліку чакаюць кепскія перспэктывы.

– У звязку з усім вышэйсказаным, лягічна меркаваць, што вы будзеце імкнуцца ў эканамічную камісыю Палаты прадстаўнікоў.

– Не хачу сам сябе вылучаць, але хацелася б, каб туды людзі разумныя прыйшлі. Выступаючы ў прэзыдэнта ў першы раз, я ўздымаў пытаньне, каб нас, дэпутатаў, не дзялілі на малодшых і старэйшых братоў. Натуральна, гэта працягваецца, і працягвацца будзе. Хацелася б, каб разумныя людзі ўзначалілі камісыі па бюджэце, па эканоміцы, па іншых напрамках. Самае галоўнае, каб у камісыі не прыйшлі людзі, якія толькі хочуць узначаліць камісыі. Я пайду або ў бюджэтную, або ў эканамічную. Кім я там буду, я не магу сёньня сказаць.

– Удакладніце, калі ласка, наконт старэйшых і малодшых братоў.

– Гэта маюцца на ўвазе старыя дэпутаты й новыя. Партфэлі пасьвінны дзяліцца справядліва. Я заўстрыў гэта на сходзе дэпутатаў (я ўлучаны ў працоўную групу па стварэньню гэтых камісый). Сёньня ставіцца пытаньне, колькі камісый мусіць быць. Мы мяркуем стварыць 14 камісый. У нас з горадам Менскам сем рэгіёнаў. Гэта нязначныя затраты, якія прынясуць больш плёну.

У прыватнасьці, у мяне ёсьць прыклад камісыі па ахове здароўя, фізычнай культуры, спорту й моладзі. Я б гэтую камісыю разьдзяліў на дзьве. Зрабіў ахову здароўя й фізычную культуру асобна, а па справах моладзі– асобна. Камісыі будуць стварацца мэтанакіравана. У нас ужо адна камісыя нарадзілася. Яна раней спэцыялізавалася выключна ў эканоміцы, а цяпер разьдзялілася (хаця гэта яшчэ толькі прапанова прэзыдэнту, у нас усё вырашае прэзыдэнт) на групы па пытаньнях эканамічнае палітыкі, прадпрымальніцтва й навукова-тэхнічнага прагрэсу. Другая камісыя, якую разьдзялілі, па пытаньнях будаўніцтва, прамысловасьці, транспарту, гандлю й аблугоўваньня. Цяпер яна падзялілася на дзьве. Гэта зроблена, каб камісыі працавалі пасьлядоўна, а не так, што па адным участку прабеглі, а на астатні забыліся.

– Якіх, на вашую думку, паўнамоцтваў цяпер не стае парлямэнту?

– Сёньня дэпутат ідзе кланяецца звычайнаму клерку ў кіраваньні справамі прэзыдэнта. Па якіх пытаньнях? Па сваёй заработнай плаце. Парлямэнт мусіць быць самастойным у сваёй фінансавай дзейнасьці. У нас жа свая кантрольна-рэвізыйная камісыя ёсьць, перад якой мы мусім даваць справаздачу і ўсё. Я б жадаў, каб мы хаця б маглі прызначаць міністраў. І спытаць зь міністра за ягоную працу. Прэм'ер-міністар няхай прэзыдэнтам ужо прызначаецца. Ня ведаю, якія прэзыдэнт пасуначотвы аддаць вырашыць. А інакш няма ўзьдзеяньня парлямэнту на ўрад. А як парлямэнт можа ўзьдзейнічаць на выканаўчую ўладу, калі ягоныя законы не праходзяць без папярэдняга пакалону міністру?

МАС-МЭДЫЯ

ЧАЦЬВЁРТАЯ ЎЛАДА

Тацьцяна ПАПОВА

Адным з фактараў дэмакратычнасьці дзяржаўнага ладу ва ўсім сьвеце ёсьць уплывовасьць й высокі ўзровень разьвіцьця сыстэмы сродкаў масавае інфармацыі. Па колькасьці газэт, часапісаў, радыёстанцый дый тэлеканалаў Беларусь займае другое месца ў Эўропе. З канца, пасьля Альбаніі.

Сьціпленькі рынак мас-мэдыя пакідае чытачу небагаты выбар. Дзяржаўныя выданьні набываюць па звычцы ці з прычыны іх нізкіх коштаў (якія забясьпечваюцца бюджэтнымі датацыямі ды льготнымі тарыфамі на друк і распаўсюджаньне). Незалежная ад лукашэнкавае кармушкі прэса змушаная прадаваць свае наклады ніжэй сабекошту.

Увагу неабыякавага да грамадзка-палітычнага жыцьця сваёй краіны чытача можа прыцягнуць толькі сэнсацыя ці надзвычайны выпадак. Апошняй шумнай падзеяй у Беларусі сталіся парлямэнцкія выбары. «Цэнтар за свабоду слова на карысьць дэмакратыі» праводзіў маніторынг беларускае прэсы й тэлепраграм на працягу трох месяцаў, што папярэдничалі прымусоваму волевыяўленьню народа адносна сваіх новых прадстаўнікоў у Нацсходзе.

Колькасьць газэт, што прапануюць шапікі Белсаюздруку й Белпошты, заціснутая ў цесныя рамкі абмежаванасьці тэматычнага й пазыцыйнага выбару. 88 адсоткаў месца на палітычных палосах «Советской Белоруссии», «7 дней» ды «Рэспублікі» аддаецца пад матэрыялы, прысьвечаныя Лукашэнку й іншым уладнікам.

Апазыцыя згадваецца ўдзесяцёра радзей, прычым нэйтральных матар'ялаў аб ёй амаль няма. Найчасьцей аб дэмакратах пішуць паблажліва ці зь іроніяй. Заблукаўшых апазыцыйных авечак часам згадваюць і добрым словам, але толькі ў выпадку, калі тыя ўрэшце натрапілі на слушны шлях падпарадкаванасьці прэзыдэнцкім правілам гульні. Адносныя вынікі маніторынгу кожнай з гэтых газэт не маюць істотных адрозьненьняў. Дзяржаўныя выданьні ёсьць нібыта аддзеламі аднаго вялікага й скіраванага на дасягненьне аднае мэты мэдыяўтварэньня.

Прафэсыйная журналістыка патрабуе змаганьня за чытачоў, а значыць, задавальненьня розных густаў. Незалежны друк праяўляе варыятыўнасьць у тактыцы свайго ўзьдзеяньня на аўдыторыю. На двух траціны плошчы *«Народнае волі»* ўслаўляюцца беларускія апазыцыянэры. *«Белорусская деловая газета»* большай часткай (70 адсоткаў) сваіх артыкулаў выкрывае злачынствы ўлады. Па іх меркаваньні, роля прыхільнікаў Лукашэнкі ў палітычным жыцьці краіны значна больш істотная ў параўнаньні з апазыцыйнай чыннасьцю, пра якую распавядаецца толькі ў 25 адсотках матэр'ялаў БДГ.

Мясцічковая журналістыка кампэнсуе недахоп прафэсыяналізму радыкальнасьцю сваіх пазыцый. Віцебская *«Заря»* жорстка разьмежавала адмоўныя матэр'ялы, прысьвечаныя апазыцыянэрам, і станоўчыя (у скрайнім выпадку нэйтральныя) артыкулы пра гэройствы ўлад. *«Віцьбічы»* старанна ствараюць свой імідж аб'ектыўнага дзяржаўнага выданьня. Збалянсаванасьць інфармацыі выяўляецца ў роўнасьці аб'ёмаў аб уладзе й апазыцыі. Асобным аб'ектам маніторынгу на палосах гэтае газэты можна вылучыць партыі й іх лідэраў. Яны пакуль ня ёсьць прадстаўнікамі ўлады, але й з апазыцыяй сябе не атаясамліваюць. Зноў жа, за пэрыяд маніторынгу гэта газэта ані слоўцам не абразіла сваіх дзяржаўных карміцеляў і не дала ніводнае пазытыўнае ацэнкі дзейнасьці апазыцыянэраў. Наадварот, рэкордна вялікая колькасьць бруду, пэўне па звычцы, на ўсялякі выпадак, была вылітая на бясшкодны ў перадвыбарнай кампаніі БНФ.

Пасьлядоўную антыўрадавую лінію гнуў на працягу пэрыяду маніторынгу *«Віцебскі кур'ер»*. Шмат для каго ён можа стаць прыкладам узорнае апазыцыйнае прэсы, бо мае паказальнікі, процілеглыя вынікам маніторынгу *«Рэспублікі»*. Але гэтыя выданьні нельга паставіць на адну дошку з-за розьніцы тэрыторыі й маштабаў распаўсюджанасьці, а значыць, і сфэраў узьдзеяньня на чытацкую аўдыторыю.



«Брэсцкі кур'ер» выдзяляе прыкладна аднолькавыя плошчы для аналізу дзейнасьці ўлады й апазыцыі, але ў матэр'ялах аб прапрэзыдэнцкіх структурах ён намагаецца бараніць інтарэсы сваёй аўдыторыі. Пра ўладу ён піша або нэйтральна, або ўздымаючы ўсе хібы кіруючых беларусамі асоб. Старонкі гэтага выданьня могуць пахваліцца аб'ектыўнасьцю ў дачыненьні й да апазыцыі. У залежнасьці ад учынкаў лябедзькаў, вячоркаў ды іх прыхільнікаў, газэта друкуе станоўчыя, нэйтральныя, а часам і адмоўныя матэр'ялы.

Беларускае тэлебачаньне стала ўтрымлівае дзяржаўную манаполію на распаўсюд тэлеінфармацыі. Яно кантралюе працэс рэляксацыі грамадзян перад сном. Разьвітаўшыся з Маляваньчам і Даўгавушкам, дзеткі ідуць у ложкі, а іх надзеленыя правам голасу бацькі глядзяць *«Панараму»* й *«Рэзанансы»*.

Героямі 78-мі адсоткаў сюжэтаў АТН у кастрычніку былі прэзыдэнт й уладныя структуры, 16 адсоткаў эфірнага часу прысьвячалася апазыцыянэрам і 6 адсоткаў – каб разбавіць камплемэнтарнасьць – праўрадавым партыям ды іх лідэрам. Для параўнаньня, у верасьні пра Лукашэнку, апазыцыянэраў і партыі, што жадалі б пралезьці ва ўладу, БТшнікі паказалі адпаведна 81, 17 і 2 адсоткі сюжэтаў. Уздым увагі да да партыяў у кастрычніку тлумачыцца частым пералікам прэтэндэнтаў на парлямэнцкія партфэлі.

Тое, што імёны прэзыдэнта й ягонай каманды ў верасьні не сыходзілі з вуснаў Казіяткі, Косьціна й іншых АТНаўскіх зорак, а постаці гэтых палітыкаў не зьнікалі з экранаў *«Гарызонтаў»*, не столькі стварала добры грунт для апошняга этапу дэпутацкае кампаніі, колькі забясьпечвала пасьпяховасьць пачатковага пэрыяду перадвыбарнае агітацыі Лукашэнкі. Беларускі лідэр у самы гарачы перадвыбарны час згадваўся на тэлебачаньні ў 8 разоў часьцей за старшыню Цэнтарвыбаркаму Ярмошыну, у дзесяцёра часьцей за невядома чаму ўпадабаную БТшнікамі кандыдатку Абрамаву, у 64 – за паўсюднага Красуцкага (таксама кандыдата) й у 139 – за палатніка-вэтэрана Малафеева. Нават спрэчныя паводзіны Статкевіча камэнтаваліся АТНаўцамі ў 113 разоў менш інтэнсыўна, чым бацькавы подзывігі.

Стваральнікі беларускіх тэлеканавін працавалі ў звышнапружаным тэмпе. Падрыхтоўка большае часткі хранамэтражу вымагала штодзённага вандраванья карэспандэнтаў па заводах і калгасах, цяганьня з сабою цяжкое апаратуры. Затое тэксты тэлежурналістам можна было амаль не пісаць. Прадстаўнікі ўлады выказваліся ад першае асобы. Асьвятленьне дзейнасьці апазыцыі не патрабавала столькі клопатаў. Пад рукой рэдкалектыву заўжды была адна й тая ж плёнка з запісам Маршу свабоды 17 кастрычніка мінулага году. Яе пракручвалі ў запаволеным тэмпе, пакуль адзін з практыкантаў начытваў тэкст, напалову перадраны ў ранейшых асьвятляльнікаў апазыцыйнае тэматыкі.

У выніку, матэр'ялы, прысьвечаныя ўладам, набывалі станоўчы ці захоўвалі нэйтральную афарбоўку. Амаль усе сюжэты пра апазыцыю былі зьдзекліва-негатыўнымі. Невялікая колькасьць пазытыўных паказальнікаў, зафіксаваных на графіках мэдыя-маніторынгу тлумачыцца прыхільнасьцю БТ-шнікаў да абрамаўскага «Яблыка», якое першапачаткова было прылічнае маніторамі да апазыцыйных структур.

У міжвыбарны пэрыяд не даводзіцца казаць аб паслабленьні ролі мас-мэдыя як асноўнага сродку агітацыі й прапаганды. Аб'ектыўнасьць паведамленьняў і камэнтароў да падзей абавязкова адаб'ецца на выніках галасаваньня спажыўцоў мэдыяпрадукцыі. Калі тэндэнцыі, зафіксаваныя ў дасьледваньнях «Цэнтру за свабоду слова на карысьць дэмакратыі», захаваюцца й надалей, не складана спрагназаваць будучыню прэзыдэнцкае пасады ў Беларусі.



МОЛАДЗЬ

Пачні зь сябе

Аляксандар КАВАЛЬСКІ

Не зусім ўдалы дэбют маладзёвай кааліцыі «Перамена!» прымушае задумацца над тым, чым сёньня ёсьць маладзёвы рух у Беларусі, чаму ў іншых краінах студэнцтва зьяўляецца авангардам рэформаў, а ў нас саўковым адстойнікам.

Упершыню пра маладзёвы рух пачалі гаварыць у 1996 годзе, калі большасьць на трыццацітысячных дэманстрацыях складалі студэнты. Тады гэта была пакуль яшчэ не афармленая палітычная сіла, прывабленая да акцыяў пратэсту іхным унутраным карнавальным характарам. Для моладзі шэсьці й мітынгі, кіданьне камянёў у амапаўцаў былі, хутчэй, своеасаблівымі *«праздниками непослушания»*, рымскімі сатурналіямі й мардзі грасам у адным фляконе. Палітычная складовая гэтых мерапрыемстваў стаяла на другім месцы.

Самі ж пра сябе як пра самастойную сілу маладзь заявілі ў 1997 годзе, калі правялі першую акцыю без дарослых у дзень сьвятога Валянтына. На хвалі гэтага дый падобных выступленьняў паўстаў *Малады фронт* і ягоны лідар, *ды-джэй Адраджэньня*, Павал Севярынец. З таго часу беларускі маладзёвы рух ператкаецца ў адну з маладзёвых субкультур, кшталту рэпэраў, рэйвераў, ультрас ды іншых. Для яго, як і для астатніх, характэрныя свае фенечкі, слэнг, ідэалы, музычныя ідалы. Адзінае адрозьненьне палягала ў сфэры палітызавасьці гэтай маладзёвай тусоўкі.

Субкультурны этап беларускасьці быў неабходны й карысны ў нашых умовах, калі ўся моладзь вырасла ў расейскамоўным атачэньні, калі родную беларускую мову вывучалі як замежную ў школе, і праз школу прывіваўся комплекс непаўнавартасьці беларускае культуры.

Толькі ў досыць сьвядомым узросьце частка моладзі адкрывала для сябе замест школьна-праграмнага беларускага эрзацу сапраўднае багацьце роднае культуры. Для большасьці ж беларускасьць па-ранейшаму асацыявалася з тым паскудствам, якое прымушалі спажываць на ўроках мовы й літаратуры. Стварэньне прывабнага вобразу беларускасьці для моладзі стала першачарговай задачай, задачай складаней, бо прыходзілася ламаць стэрэатыпы аб архаічнасьці й фальклёрнасьці ўсяго беларускага. Зьяўленьне маладзёвай палітычнай субкультуры сьведчыла пра першыя посьпехі на гэтым шляху.

Затуханьне маладзёвых пратэстаў пасьля 1997 году й відавочны правал акцыі 12 лістапада ў Менску сьведчыць пра крызу старой адраджэнскай парадыгмы. Субкультура па вызначэньню ня можа ахапіць усю культурную прастору. Датычна маладзёвага палітычнага руху усё гэта значыць, што трэба зноўку ісьці ў народ, асвойваць іншыя субкультуры, адчыняць іх для сябе й адначасова самім станавіцца адкрытымі для іх.

Стаўка некаторых быццам бы маладых лідараў на «піжакі й камуфляж» (інтэлектуалаў і баевікоў), замыканьне ў псэўдаэлітарнасьці ёсьць тактыкай пазаўчорашняга дня, тактыкай няўдачнікаў, хранічных лузэраў (losers), як кажуць амэрыканцы. Кааліцыя «Перамена!», якая на дзьве трэці складаецца з тусовак, чыя дзейнасьць нацэлена й абмяжоўваецца фандрайзінгам (разьвядзеньнем замежных фондаў на гранты), павінна пачаць перамены зь сябе. Інакш яе чакае лёс іншай кааліцыі – *Маладой Беларусі* – аб якой зараз, мабыць, ніхто й ня памятае.

Моладзь ужо не вядзецца на старыя лёзунгі й прыёмы. Радыкальнае змаганьне за Беларусь, кіданьне камянямі, штурм амапаўскіх шэрагаў, адсідкі на Акрэсьціна ніколі ня стануць прывабнымі для ўсіх. Страціў сваю актуальнасьць і вобраз самаахвярнага рэвалюцыянэра-аскета, апантаннага барацьбіта, біблейскага прарока. Яго месца займае другі архетып – культурны герой, кшталту Прамэтэя. Грэцкага тытана людзі палюбілі не за тое, што ён змагаўся супраць багоў, а за тое, што ён падараваў ім агонь. Для тых часоў гэта было раўназначна дараванью культуры, выхаду зь дзікасьці, рэзкаму пашырэньню далягляду.

Такі ж якасны скачок у нашых умовах значыць пашырэньне беларускага кантэксту на ўсе праявы культуры, яе выхад з эстэтычнай рэзэрвацыі, намі ж і акрэсьленай: змаганьне, піва, рок-н-рол. Чаму ня штосьці ішэраг? Напрыклад, кіслата, рэйв і віртуальная прастора. У беларускасьці не павінна быць ніякіх эстэтычных межаў, калі мы жадаем, каб яна жыла й самаўзнаўлялася. Добра, хоць зараз беларускую эстэтычную аднастайнасьць парушаюць анархісты з *«Чырвонага жонда»* ды сэксуальныя меншасьці Эдзіка Тарлецкага.

ФІЛОСОФИЯ

Выбор делает экзистенция

Алесей МАКОВЕЦ

Немногие в Беларуси слышали имя французского философа Жана Поля Сартра. Еще меньше людей знакомо с его концепцией человеческой свободы.

Личность в царстве безличия

Тридцатые годы были мрачноватым временем для европейских интеллектуалов. Первая мировая война похоронила иллюзию единства научно-технического прогресса с общественным. На смену традиционному человеку аграрной культуры пришел массовый, стандартизированный человек конвейера.

Механистическое мировоззрение не только устранило человека из центра вселенной, но и удалило из нее Бога. Религия уже не играла той роли, что в прежние времена. Многое в духовном пейзаже Европы между двумя мировыми войнами напоминало нынешнее белорусское уныние. Человек, отторгнутый от потустороннего мира смыслов, очутился в мире обезличенных, штампованных вещей.

На волне механицизма, стандартизации и религиозного кризиса набирают силу тоталитарные режимы. Малочисленные и дезориентированные, невостребованные промышленной толпой, интеллектуалы предчувствуют наступление катастрофы. Их предчувствия сбываются – Дахау, Освенцим, ГУЛАГ, новая мировая война.

Экзистенциализм. Мир только задан

Как быть свободной личности в этом мире безликих вещей и людей? Что составляет основу человеческой свободы? Варианты ответа на эти вопросы предложил экзистенциализм – философское течение, популярное среди интеллектуалов первой половины двадцатого века.

Базовым в философии экзистенциализма выступает принцип: существование предшествует сущности. Мир не дан человеку, как и человек не есть нечто раз и навсегда законченное. Мир задан в своих возможностях, мир есть история. Мир вокруг творится в каждом новом акте человеческого выбора.

Философия экзистенциализма пыталась разрешить проблемы одинокой, автономной личности, противостоящей враждебному миру. Враждебный мир – это бездумная человеческая масса, навязывающая свои предрассудки и образ жизни. Это лишенный религиозного измерения мир бессмысленных вещей и происшествий. Это бюрократическая машина, действующая по своим законам вне какой-либо человеческой логики.

Заслуга экзистенциалистов – в осмысление возможностей человеческой свободы в мире, созданном индустриальной цивилизацией. Результаты духовных поисков экзистенциалистов оказались широко востребованы. Уже после Второй мировой войны французские философы-экзистенциалисты занимают почетное место среди предтеч контркультурной революции шестидесятых. А среди них особняком выделяется Жан Поль Сартр.

Выбирать приходится

В своих произведениях Жан Поль Сартр достаточно четко обосновал тезис о человеческой свободе. Человек в здравом уме и трезвой памяти всегда совершает выбор; выбирать приходится постоянно. Уже сам факт того, что мы живем, означает, что мы делаем выбор в пользу жизни, а не самоубийства.

Сартр показывает: действие или бездействие равнозначны. В любом случае человеку приходится иметь дело с последствиями как совершенного поступка, так и несовершенного. Бездействие – то же самое действие. Его последствия и есть тот самый мир, что станет объективной данностью в следующую минуту.

Основной вывод философии Сартра: человек свободен выбирать, но ответственность за выбор всегда лежит на нем. Нельзя уйти ни от ситуации выбора, ни от ее последствий. Отказываясь выбирать, предпочитая плыть по

➲ *Окончание на стр. 6*

АРХИВ

1999 — год исчезновений

Игорь ВОЛЯНИК, Александр КАВАЛЬСКИЙ

Дембель-99. 20 июля не стало первого президента Республики Беларусь. То есть он, конечно, не умер, но перестал быть президентом страны, оставшись лишь президентом Национального олимпийского комитета. Об этом Лукашенко недвусмысленно напомнила оппозиция. Наиболее зрелищно это выглядело в исполнении самого эпатажного художника Беларуси Алеся Пушкина. С утра пораньше художник подкатил к резиденции на Карла Маркса, 38 тележку с навозом, плакатами Лукашенко, купюрами белорусских рублей, наручниками и другими символами режима и вывалил все это на глазах изумленных милиционеров прямо возле входа. Перфоманс назывался *«Падзяка ППРБ за пяцігадовую кпучую цяжкую выніковую працу дзеля народа»* и заслужил наивысшие оценки судей – два года условно по ст. 201 ч.2 УК.

Продолжением всенародного ликования по поводу окончания президентских полномочий стало заседание в здании филфака БГУ Верховного Совета, где было принято решение о назначении Виктора Гончара первым заместителем спикера. (Если бы в соответствии с Конституцией Семен Шарецкий принял полномочия президента, а не сбежал в Литву, то Виктор Гончар автоматически возглавил бы ВС). Новый вице-спикер вышел к митингующим сторонникам и сообщил, что отныне гражданин Лукашенко перестал быть президентом. Гулянье продолжилось на Октябрьской площади. Более полусотни человек были задержаны милицией.

Desaparecidos. Беларусь все больше напоминает латиноамериканскую страну не только обилием бананов, но и таинственными исчезновениями виднейших политиков. Первой пропала Тамара Винникова. Причем исчезла не просто так, а из-под домашнего ареста. С самого начала ходили слухи, что ее выкупили у спецслужб родственники. Косвенно это подтвердилось в конце года, когда экс-банкирша вдруг объявилась и начала раздавать интервью белорусской и зарубежной прессе.

Следующим исчезнувшим стал экс-министр внутренних дел Юрий Захаренко, а в сентябре по дороге из бани домой пропал Виктор Гончар со своим другом бизнесменом Анатолием Красовским. Президент тут же озвучил версию, что Гончара украли бандиты, дававшие ему деньги на президентские выборы, и которым он эти деньги не вернул. Но гораздо правдоподобнее была версия, что в стране запахло эскадронами смерти. Тем более, что и за Захаренко, и за Гончаром ходила наружка. Она не могла не видеть похищений.

Поговорили – и хватит. КНГ ОБСЕ пытается заставить власть и оппозицию пойти на взаимные уступки и начать переговоры о выходе из политического тупика. Власть не собирается ни с кем договариваться, а оппозиция не жепает участвовать в косметическом ремонте режимного фасада. Внимание международных структур все-таки заставляет начать консультации между экспертными группами власти и демсил.

Договорились до предоставления демократической оппозиции доступа к монополизированным государством средствам массовой информации. Предполагалось выделять несколько минут эфира на БТ, на радио, даже в районках должна была появиться колонка демократов. Но договорились об этом только с уполномоченным вести консультации со стороны президента Михаилом Сазоновым. Сам же Лукашенко в очередной раз продемонстрировал, кто в доме хозяин, и отказался от всех договоренностей.

Весь год белорусский вопрос был одним из важнейших в повестке европейских саммитов, и только на Стамбульской встрече ОБСЕ он остался в тени возобновившейся войны в Чечне.

Союз нерушимый. Недолгую историю Содружества России и Беларуси (1996) сменила также непродолжительная история Союза России и Беларуси (1997). Не выдержав двухлетнего творческого застоя, президенты двух стран подписали очередной союзный договор. Чтобы заинтриговать публику банальным событием, гражданам двух стран сначала было предложено всенародно одобрить проект союзного устава (кстати говоря, именно этот проект, *«обсужденный»* и *«одобренный»*, никто потом не подписал). Затем дедушка Ельцин заставил поволноваться своего молодого спортивного коллегу, отложив встречу из-за болезни почти на две недели. В итоге, чтобы не повторяться, подписанный документ назвали договором о намерении создать союзное государство.

По-своему понимая интеграцию, 3 июля, в лукашенковский день независимости, вооруженные пневматическим оружием и муляжами автоматов члены юношеского военно-патриотического клуба «Беркут» из Сургута захватили белорусскую деревню Николаевка. Жителей деревни избили, связали, согнали к школе. С сельсовета был сорван государственный красно-зеленый флаг, а на его место повешен андреевский. Так русские патриоты имитировали освобождение нашей деревни от немцев.

МУЗЫКА

ЯГО ВЯЛІКАСЬЦЬ ДЖАЗ

Глеб РУБАНАЎ

Джазавы фэст, што адбыўся ў Менску, стаў сапраўднай падзеяй культурнага жыцьця Беларусі. На тры дні сцэну Цэнтральнага дому афіцэраў акупавалі прадстаўнікі розных краінаў, розных джазавых плыняў, розных школаў выкананьня. Аб'ядноўвалі іх прафэсыйнасьць і... яго вялікасьць ДЖАЗ.

Алчынялі праграму гаспадары. Публіку вітала шырока разрэкламаваная «Камэрата». Унікальны калектыў, які шасьцю галасамі стварае паўнавартасную й насычаную музыку. Яго прафэсыйнасьць і дасканаласьць не выклікаюць сумневаў. Але шмат хто з публікі наракаў на выступоўцаў за залішні акадэмізм. Усё ж такі сапраўдны джаз – гэта найперш імправізацыя і нараджэньне музыкі ў шчыльным кантакце з заляй. Дарэчы, лёгкая хвароба на акадэмізм – адметная рыса беларускіх выканаўцаў. Усе астатнія (нават майстры сусьветнага клясу) выглядалі значна больш разьняволенымі. Што тычыць мэлядычнасьці й аранжыровак, то тут ніякіх пытаньняў няма – імя «Камэраты» ўсё ж такі нешта значыць.

Падчас выступу *«Второго приближения»* гледачы адзначылі ігру кантрабасыста Іванушкіна й пэркусыяніста Вано Абаліяні. Таленавіты музыкант уражваў публіку, атрымліваючы гукі з самых мудрагелістых інструмэнтаў. Увогуле, выступ калектыву адбыўся на належным узроўні. Эксперыментальная манера ігры ў параўнаньні зь першай часткай выглядала даволі эпатажна. Агульныя ўражаньні ад творчасьці «Второго приближения» – пэўная элітарнасьць выкананьня ў спалучэньні з авангардным формай.

Лок і Бутман

Выступ у Менску знакамітага квінтэта Джо Лока й Ігара Бутмана стаў часткай гастрольнага турнэ калектыву. Сусьветна вядомыя музыканты за дзьве гадзіны канцэрту падаравалі слухачам сапраўдную Музыку.

Саксафаніст Ігар Бутман вядомы не толькі ў Эўропе, але й за акіянам, зь ім працаваў сам Гровэр Вашынгтан. Амэрыканец Джо Лок стварае непаўторную музычную атмасфэру з дапамогай незвычайнага інструмэнта – вібрафону. Разам зь імі робяць джаз Арцём Варонін (фартэп'яна), Віталь Саламонаў (кантрабас) і Эдуард Зізяк(бубны).

Выступ квінтэту дазволіў нават самаму далёкаму ад музыкі чалавеку зразумець, што такое джаз. Няма сэнсу пераказваць штосьці словамі. Гэта было шоу, у якім музыка нараджалася на сцэне. Яскравы бразільскі джаз з запальваючымі барабаннымі сола. Пяшчотная і сумная мэлёдыя «Брыльянты застаюцца назаўжды». Неўміручая музыка Дзюка Эліінгтана. Локаўскія «Недзе нас чакаюць» і «Распуцін дэнс». Апошняя п'еса, як патлумачыў Бутман, была навеяна ўражаньнямі Джо Лока ад вандровак па Расеі.

Сэнсацыя

У гэтым квартэце пяцёра чалавек. Пяцёра, таму што вакалістка Неда Маланавічутэ катэгарычна не жадае вылучацца з калектыву. *Neda Vilnius Jazz Quartet* гэта бліскучы авангардны джаз-праект. Ягоныя ўдзельнікі – вучні й паплечнікі майстра імправізацыі Ўладзіміра Чэкасіна. Менавіта гэты калектыў стаў адкрыццём і падзеяй усяго фестывалю. Тое што яны граюць – сплаў неверагодных рэчаў: блюзу, джазу й нават псыхадэлікі – аказвае неверагоднае ўражаньне на публіку. Экспрэсыўнасьць, найвышэйшая імправізацыйнасьць у спалучэньні зь бясспрэчным майстэрствам – вось непаўторная адметнасьць літоўскага калектыву.

Феерычная дзея на сцэне ўяўляла сабой нешта большае за звычайнае шоу. Гэта было яднаньне публікі й музыкантаў. Сола Вітаса Лабуціса на двух саксафонах адначасова. Віртуозны Алег Малакаедаў і гульня чыстым клявішным гукам ды складанымі электроннымі партыямі. Над усім гэтым неверагодна пластычны й моцны вакал Неды: то па-блюзаву шчыры й уражваючы, то імклівa імправізацыйны. Музыканты заваёўвалі слухачоў з кожнай партыяй, з кожным момантам.

Да яскравай энергетыкі музыкантаў не застаўся раўнадушным ніхто з гледачоў. Нават джазавыя рэтраграды й артадоксы былі ўражаныя выступленьнем літоўцаў. Майстэрства не ведае стылёвых межаў. У гэтай музыцы арганічна гучаць і тырольскія сьпевы, і дуэт флейты з саксафонам, і сола на тамтамах. Напрыканцы ўсе музыканты ўключыліся ў галасавую перапеўку. Малакаедаў і Лабуціс саліравалі на дзвюх трубах і двух саксафонах адначасова, а Неда скончыла апошнюю кампазыцыю цытатай з бітлоўскай «Хэй, Джуд!». Уражаная бліскучым выступам публіка адзінадушна патрабавала музыкантаў на біс.

Фінал

Трыо Сяргея Манукяна – трэці найшыкавейшы калектыў на фэсьце. Сам музыкант валодае трыма музычнымі сьпецыялізацыямі: бубнача, клявішніка й вакаліста. Разам зь ім граюць выдатны скрыпач Фэлікс Лакуні ды вядомы па выступе *«Второго приближения»* бубнач Вано Абаліяні. Тое, што выконвае трыо, – сумесь джаза й блюза з выразна амэрыканскім блюзавым вакалам. Але незалежна ад стылёвых характарыстык музыка на сто адсоткаў перадае сапраўдны джазавы дух.

Манукян выступаў увечары непасрэдна перад гала-канцэртам. Сонечная ўсьмешка, якую вакаліст дарыў слухачам, дух добрыні і любові нарадзілі ў залі асаблівую атмасфэру. Публіка слухала затаіўшы дыханьне і выбухала апляцысмэнтамі пасьля кожнай мэлёдыі.

У гала-канцэрце прынялі ўдзел лепшыя беларускія джаз-калектывы. На ўзроўні выступілі «Камэрата» і малады, але перспектыўны «Дыліжанс». Цікавым было выступленьне калектыву Green Stream пад кіраўніцтвам Уладзіміра Бялова, са своеасаблівым жаночым вакалам і выразнымі басовымі партыямі. Але сапраўдны фурор зноў зрабіла Неда, якая далучылася да музыкантаў *Green Stream*.

Варта было прыйсьці сюды хаця б дзеля такога фіналу. Пад шквал апляцысмэнтаў *RADO Jazz-2000* адышоў у гісторыю. Да сустрэчы праз год.

P.S. Праз хвіліну пасьля выступу мы размаўлялі з Недай Малanавічутэ за кулісамі. Сьпявачка, якая вызначыла твар усяго фестывалю, выглядала шчасьлівай і трохи разгубленай.

«Мы ня першы раз у Менску, і заўсёды нас прымаюць проста выдатна. У гэтым адрозьненьне ад Літвы, дзе ўсе ўжо прызвычаіліся да джазу. Гэта вельмі прыемна, калі людзі падыходзяць пасьля канцэрту й дзякуюць, і не шкадуюць камплімэнтаў. Я хачу пажадаць менскай публіцы, каб яна захоўвала гэтую цеплыню. Ведайце, мы заўсёды гатовыя прыязджаць у ваш горад. Хай толькі запрашаюць...»

ФИЛОСОФИЯ

Выбор делает экзистенция

Окончание. Начало на стр. 5

течению обстоятельств, человек выбирает отказ от выбора. В итоге, жизненные обстоятельства, внушающие ему страх, недовольство, отвращение, – его заслуга. Это тот самый мир, что он выбрал отказом от действия.

Человек ответственен за свою судьбу. Но, более того, и за судьбу всего мира.

Иллюзорность несвободы

Неизбежность выбора определяет фатальный характер человеческой свободы. Выбор из возможных альтернатив всегда оставляет последнее слово за человеком. Ответственность нельзя ни на кого переложить, даже на Бога. От свободы некуда бежать. Отказ от свободы – тоже акт свободного выбора. У человека нет оправданий.

Актуальность философии Сартра и для послевоенного Запада, и для нынешней Беларуси – в разоблачении иллюзии несвободы. Из этой философии следуют интересные социологические выводы.

Социальная реальность не есть нечто самостоятельное и существующее вне индивидуума. Соглашаясь на мирное сосуществование с репрессивной системой, диктатурой, человек выбирает диктатуру. Жертва обстоятельств в той или иной степени оказывается их соучастником. Ситуация определяется личным выбором. Даже если выбор ограничен, он всегда есть. Французское сопротивление, битники, хиппи, диссиденты следовали этой максиме.

Жан Поль Сартр в одном из парижских кафе

Плоды просвещения

Ныне экзистенциализм занял свое место в культурном архиве западной цивилизации. Положения некогда оригинальной философии усвоены коллективной памятью, вошли в подсознание культуры.

Когда передовой индустриальный Запад отошел от последствий второй мировой войны, проблема общей сытости была решена. И тут оказалось, что в сытом обществе масса недовольных молодых людей, озабоченных проблемой свободы. Столь милый белорусам идеал сытого брюха много кому не понравился. В экономически благополучной Америке и Западной Европе набирало силу контркультурное движение за свободную личность. А начиналось все гораздо раньше, не в сытые шестидесятые, под раскаты рок-н-ролла, а в тревожные тридцатые под джаз. Рок-н-рольщики только принимали эстафету.

Культурный бунт недовольных молодых людей повысил общий уровень либерализма в цивилизованном мире. Массовые выступления шестидесятых не изжили, но порядком смягчили репрессивный социальный контроль.

Инакомыслящие

